2. Протоколы заседаний ЭКОСО БССР, Белкоопсоюза, белорусского бюро синдикатов, ..., переписка с торговыми организациями о регистрации сделок, ликвидации Могилевской товарной биржи... 28 ноября 1925 г. — 31 декабря 1926 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 49.

3. Протоколы заседаний ЭКОСО БССР, котировальной комиссии, регистрационного бюро и биржевого комитета Минской и Могилевской товарных бирж. 9 января — 28 декабря 1925 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 62.

4. Об открытии товарной биржи в Могилеве. 14 января — 28 декабря 1925 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 298.

5. Доклады инспектора об обследовании работы Белорусской конторы «Кредитбюро», ..., списки сотрудников Минской товарной биржи. 11 января 1926 г. — 8 января 1927 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 312.

6. Протоколы заседаний регистрационного бюро, котировальной комиссии, биржевого комитета, арбитражной комиссии и секций Минской товарной биржи, доклад инспектора НК РКИ БССР об обследовании Витебской, Минской и Могилевской товарных бирж и сведения о внебиржевых сделках. 13 января — 30 сентября 1926 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 365.

7. Протоколы заседаний регистрационного бюро, котировальной комиссии, биржевого комитета, арбитражной комиссии и секций Могилевской товарной биржи за 1926 г. 2 февраля — 7 сентября 1926 г. // Нац. архив Респ. Беларусь. — Фонд 117. — Оп. 1. — Д. 368.

***Т.І. Палікоўская,***
*кандыдат гістарычных навук*

# ПРАБЛЕМЫ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX — 20-х гг. XX ст. ДА АДЛЮСТРАВАННЯ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ОРДЭНА ЕЗУІТАЎ НА БЕЛАРУСІ

*У артыкуле характарызуюцца асноўныя асаблівасці тэндэнцый у развіцці айчыннай навуковай думкі другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. гісторыі адукацыйнай дзейнасці езуітаў на Беларусі. Аналізу былі падвергнуты навуковыя даследаванні А.П. Дзем'яновіча, А.К. Кіркора, М.В. Доўнар-Запольскага, У.М. Ігнатоўскага, Я.Ф. Карскага, І.Я. Мітрашэнкі, У.І. Пічэты, А.П. Сапунова. Вызначаны асновы метадалагічнай накіраванасці айчыннай гістарыяграфіі, канцэптуальныя падыходы, прадметнае дамінаванне вывучэння тэмы і ступень яе даследаванасці.*

## Уводзіны

Гісторыя адукацыйнай дзейнасці манаскага каталіцкага ордэна езуітаў на беларускіх землях — неад'емная частка мінулага Бацькаўшчыны. Без яе належнага гістарыяграфічнага даследавання нельга вызначыць месца асветніцкай ролі ордэна ў сістэме айчынных гістарычных ведаў. Таму даследаванне эвалюцыі гістарыяграфіі дадзенай праблемы неабходна для разумення асноў агульнага гістарычнага працэсу.

Мэтай даследавання з'яўляецца вызначэнне змястоўных і сутнастных асаблівасцей падыходаў да адлюстравання адукацыйнай дзейнасці езуітаў у айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. Назапашаны комплекс беларускай навуковай літаратуры другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. утрымлівае шэраг супярэчнасцей, якія ўзніклі ў навукова-даследчым працэсе ў асяроддзі гісторыкаў. Большасць даследаванняў гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на сённяшні дзень маюць незавершаны і ідэалагізаваны характар. Актуальнасць тэмы на дзяржаўным узроўні вынікае з неабходнасці вывучэння праблем гісторыі канфесій на Беларусі. У сувязі з гла-

бальнасцю міжнацыянальных і міжрэлігійных канфліктаў узнікла патрэба ў расшыфроўцы элементаў свядомасці беларускага народа, здольнага да талерантнага існавання ў рамках шматнацыянальнай дзяржавы на працягу XVI—XVIII ст. Выяўленне тэарэтыка-метадалагічных праблем, галоўных высноў айчыннай гістарыяграфіі пытання дазволіць выразшыць акрэсленыя цяжкасці навуковага працэсу. Гэта таксама дазволіць крытычна падысці да навуковай значнасці ўсталяваных канцэптуальных падыходаў да гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях, зняць ідэалагічныя штампы з навуковай спадчыны айчынных гісторыкаў.

Фарміраванне гістарыяграфіі на Беларусі абумоцлена з'яўленнем прац абагульняючага характару, у якіх аналізаваліся вынікі вывучэння гісторыі Беларусі, у тым ліку аспекты адукацыйнай справы езуітаў. У рабоце разгледжаны першыя спецыяльныя работы беларускіх гісторыкаў другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. А.П. Дзем'яновіча, А.К. Кіркора, М.В. Доўнар-Запольскага, Я.Ф. Карскага, У.І. Пічэты, І.Я. Мітрашэнкі, А.П. Сапунова, у якіх былі адлюстраваны гістарычныя аспекты асветы Беларусі, звязаныя з культурна-асветніцкай дзейнасцю езуітаў.

## Асноўная частка

Навуковае вывучэнне гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў пачыналася з пазнавальнага апісання. Каштоўнасць «апавядаючай» гісторыі праяўлялася ў рэканструкцыі падзей у фактах гісторыі. Так, абапіраючыся на плённую работу навукоўцаў Віленскага універсітэта першай паловы XIX ст. па пошуку крыніцазнаўчага матэрыялу па праблеме, паступова адбылося ў асяроддзе айчынных гісторыкаў станаўленне нацыянальнага гістарычнага погляду на культурна-асветніцкую дзейнасць езуітаў на беларускіх землях. Дадзеная справа непасрэдна была звязана з навуковай працай А.П. Дзем'яновіча, М.В. Доўнар-Запольскага, Я.Ф. Карскага, А.К. Кіркора, І.Я. Мітрашэнкі, У.І. Пічэты, А. Сапунова, К.В. Харламповіча і інш. Работы беларускіх навукоўцаў другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. выконвалі ролю спадкаемцаў і праваднікоў навуковай спадчыны гісторыкаў-езуітаў, унеслі значны ўклад у даследаванне духоўнай культуры і асветы Беларусі.

У канцы XIX ст. гісторыі дзейнасці езуітаў на беларускіх землях была прысвечана манаграфія айчыннага навукоўца А.П. Дзем'яновіча [1]. Гісторык даследаваў механізмы адаптацыі езуітаў на Беларусі — «сферы ўплыву каталіцкай ідэалогіі» [1, с. 38], выявіў шляхі замацавання і пашырэння ўплыву ордэна на новых тэрыторыях [1, с. 62—65]. А.П. Дзем'яновіч рэзка негатыўны ахарактарызаваў прапаведніцкую і адукацыйную місію езуітаў. Трэба адзначыць, што работа цалкам выразіла заклапочанасць праваслаўнай царквы ў абароне ўласных інтарэсаў, выступіла супраць экспансійных прадпасылак каталіцызму, носьбітам якіх быў ордэн езуітаў [1, с. 38—40]. Разам з тым А. П. Дзем'яновіч адзначыў выключную ролю езуітаў у «ратаванні лацінства ў Заходняй Расіі» [1, с. 38]. Паколькі адукацыйная дзейнасць ордэна з'яўлялася часткай дадзенай палітыкі езуітаў, на думку гісторыка, то адпаведна адносіны да яе разглядаліся ў працы праз прызму апалагетычнага настрою. Нягледзячы на ідэалагізаваны характар апісання гістарычных фактаў, гісторык сваёй працай актуалізаваў гісторыю дзейнасці езуітаў на Беларусі.

Вызначальнай у вырашэнні большасці гістарычных аспектаў, звязаных з культурна-асветніцкай дзейнасцю езуітаў на Беларусі, можна назваць навуковую дзейнасць айчыннага гісторыка А.К. Кіркора. Нарысы «Просвещение и народное творчество в Литве» [4, с. 97—136 ], «Умственные силы и средства образования» [4, с. 317—328] былі прысвечаны гісторыі асветы беларускіх і літоўскіх зямель. У выданні былі адлюстраваны гістарычныя звесткі аб дзейнасці езуітаў на багатым крыніцазнаўчым матэрыяле. Вялікую ўвагу даследчык удзяліў пытанням адукацыйнай сістэмы езуітаў у Вільні і

Полацку [4, с. 318—325]. Гісторык вызначыў найбольш вядомыя асветніцкія цэнтры, але пры гэтым падкрэсліў наяўнасць шырокай сеткі навучальных устаноў ордэна па ўсяму ВКЛ [4, с. 105, 319]. Разглядаючы гісторыю стварэння і развіцця навучальных устаноў, А.К. Кіркор дакладна акрэсліў асноўныя напрамкі і сутнасць асветніцкай місіі езуітаў на беларускіх і літоўскіх землях. Паланізацыйныя тэндэнцыі, якія неслі езуіты-настаўнікі, А.К. Кіркор успрымаў як заканамерную і прагрэсіўную з'яву. На старонаках працы гісторык звярнуў увагу на праблему фарміравання грамадскай свядомасці беларускай шляхты пры дапамозе развітай адукацыйнай сістэмы езуітаў. Навуковец імкнуўся даследаваць прыроду адносін паміж езуітамі і беларускай шляхтай. Так, даследчык заўважыў, што беларуская шляхецкая эліта негатыўна рэагавала на крызісныя змяненні езуіцкай адукацыі, так і падтрымлівала рэфарматарскія памкненні ордэна ў бок прагрэсіўнасці навучальнага працэсу [4, с. 106]. Гісторык паспрабаваў разгледзіць біяграфічныя вобразы асноўных рэктараў Віленскай і Полацкай акадэмій, а таксама прафесарскага складу. Трэба адзначыць, што аўтар імкнуўся як мага паўней раскрыць «ачалавечаны» вобраз езуіта-асветніка, апісваючы другую рэальнасць гістарычнага мінулага — паўсядзённыя элементы жыцця. Трэба адзначыць, што гістарычнае апісанне А.К. Кіркора адукацыйнай справы езуітаў прываблівае на сённяшні дзень даступнасцю ўспрымання матэрыялу, цэласнасцю і лагічнасцю выкладання асноўных падзей у жыцці вышэйшых навучальных устаноў. Тым больш, што арганізацыя факталагічнай базы мае высокую ступень інфарматыўнасці. Акрамя гэтага былі закрануты пытанні ментальнага характару, якія, напрыклад, адкрылі механізмы ўплыву езуітаў на свядомасць вышэйшай эліты дзяржавы.

Дакументальная база даследавання гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў папоўнілася на унікальныя матэрыялы, выяўленыя гісторыкам А.П. Сапуновым у канцы XIX ст. і выдадзеныя ў зборніку «Віцебская старына». Навукоўцам была прадстаўлена *для аналізу брашура «Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке»* [8]. Дадзенае ананімнае выданне змяшчала інфармацыю аб дзейнасці езуітаў у сферы адукацыі. З пазіцыі крытычнага аднабаковага погляду ананімным аўтарам былі разгледжаны прынцыпы выхаваўча-навучальнай сістэмы выкладання езуітаў [8, с. 15—30]. Нягледзячы на папулярны характар брашуры, якая змяшчала погляд простага абывацеля на асветніцкую дзейнасць езуітаў на беларускіх землях, дадзенае пасланне выклікала на сёння навуковы інтарэс з пункту погляду вывучэння ментальных установак насельніцтва да настаўніка-езуіта. Дакументальная аснова, *назапашаная* А.П. Сапуновым, паслужыла базай да далейшага вывучэння гісторыі асветы езуітаў.

Канец XIX ст. быў вызначаны таксама работай ураджэнца Гродзенскай губерніі К. В. Харламповіча «Западно-русские православные школы XVI — начала XVII века, отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуги их в деле защиты православной веры и церкви» [9]. У даследаванні К.В. Харламповіч звярнуў увагу на канкурэнтныя адносіны ў сферы адукацыі паміж праваслаўнымі і каталіцкімі навучальнымі ўстановамі. Пры гэтым адзначыў палітызаваны характар асветніцкай дзейнасці езуітаў, накіраванай на павелічэнне колькасці вернікаў каталіцкага касцёла сярод шляхты ВКЛ [9, с. 231]. Разам з тым К.В. Харламповіч не абверг наяўнасць высокіх прафесійных здольнасцей настаўнікаў-езуітаў, якія маглі б з поспехам вырашыць адпаведную задачу [9, с. 86]. Такім чынам, навуковец вызначыў у сваёй працы гістарычны аспект, які быў звязаны з вывучэннем «адносін» паміж дзвюма хрысціянскімі навучальнымі сістэмамі (праваслаўнай і каталіцка-езуіцкай).

Айчынны гісторык пачатку XX ст. І.Я. Мітрашэнка ў зборніку «Віцебская старына» змесціў работу, прысвечаную дзейнасці езуітаў ва ўсходняй частцы Беларусі да 1772 г. [6]. Разбор дадзенага выдання выявіў шэраг арыгінальных поглядаў аўтара на тэму асветніцкай справы ордэна. Трэба адзначыць, што найбольш даследаванымі навукоўцам

з'яўляюцца гістарычныя сюжэты, звязаныя з адукацыйнай місіяй езуітаў у Оршы і Полацку [6, с. 2—13, 47—50]. Нягледзячы на негатыўную ацэнку дзейнасці езуітаў на беларускіх землях у цэлым, характарызуючы адукацыйную справу, І.Я. Мітрашэнка прызнаў прафесійнасць і унікальнасць езуітаў-настаўнікаў, падкрэсліў шэраг дабрачынных учынкаў членаў ордэна [6, с. 47]. Навуковец выявіў у працы асноўныя пастулаты «Уставу» — галоўнага дакумента навучальных устаноў ордэна, якія былі накіраваны, на думку аўтара, на рэгламентацыю і забарону інавацый у адукацыйнай сферы. Разам з тым І.Я. Мітрашэнка падкрэсліў наяўнасць у прафесароў-езуітаў імкненне да развіцця навуковых ведаў, пераемнасці і сінтэзу культурных здабыткаў Усходу—Захаду [6, с. 50]. І ў гэтым дачыненні, на наш погляд, аўтар акцэнтаваў увагу на ўзнікненне супярэчнасцей паміж традыцыйнымі ўстаноўкамі ордэна і тымі працэсамі, якія разбуралі схаластычнасць і кансерватызм знутры.

М.В. Доўнар-Запольскі адукацыйную дзейнасць езуітаў разглядаў у кантэксце працэсаў паланізацыі і акаталічвання беларусаў. На старонках газеты «Минский листок» ён надрукаваў цыкл артыкулаў «Беларускае мінулае» [2], дзе быў упэўнены, што пашырэнне культурных уплываў палітычнай цывільнай і рэлігійнай эліты Польшчы нанесла моцны ўдар па самастойнасці і дэмакратычных традыцыях беларусаў. Ён падкрэсліў негатыўныя праявы дзейнасці польскіх палітычных колаў, у тым ліку і лідэраў ордэна езуітаў, у напрамку апалячвання беларускай народнасці. Уплыў адукацыйнай дзейнасці езуітаў разглядаўся гісторыкам як перашкода да нацыянальна-культурнага фарміравання беларускага этнасу. Гісторык нават выкарыстаў у дачыненні да польска-каталіцкіх колаў часоў Рэчы Паспалітай метафарычны вобраз — «іга» [2, с. 34]. М.В. Доўнар-Запольскі, як і яго папярэднік А.К. Кіркор, вызначыў і падкрэсліў прысутнасць паланізатарскіх тэндэнцый у адукацыі езуітаў у бок акаталічвання, што, на погляд М.В. Доўнар-Запольскага, перашкаджала нацыяльнаму развіццю Беларусі. Адзін з першых М.В. Доўнар-Запольскі імкнуўся падкрэсліць унікальнасць і самабытнасць культуры беларускага народа. І таму расцэньваў уплыў езуітаў як замахі на дадзеныя праявы [2, с. 52].

У распрацоўку асобных аспектаў даследуемай праблемы значны ўклад унёс артыкул У.І. Пічэты «Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым» [7]. У.І. Пічэта на аснове спраў архіва Міністэрства народнай асветы даследаваў гістарычныя перадумовы існавання вышэйшай навучальнай установы на тэрыторыі ВКЛ і прыйшоў да думкі, што асновы ўзнікнення беларускага універсітэта вядуць карані ад стварэння «Віленскай Езуіцкай Акадэміі» [7, с. 10]. У.І. Пічэта ў даследаванні адзначыў шэраг прававых нормаў дадзенай адукацыйнай установы езуітаў, якія адрознівалі яе статус ад астатніх рэлігійных навучальных устаноў (права ўласнай юрысдыкцыі, наданне вучоных ступеняў, выбарная адміністрацыя). Выявіў характар царкоўна-каталіцкай выхаваўчай працы ордэна, накіраванай на пашырэнне сярод беларускай шляхты лацінска-польскай культуры [7, с. 14]. Разам з тым падкрэсліў існаванне паняцця «барацьбы» паміж усходняй (праваслаўнай) і заходняй (каталіцкай) традыцыямі навучальнага працэсу [7, с. 14—15]. Трэба падкрэсліць, што У.І. Пічэта адмаўляў мірны сінтэз і ўзаемапранікненне цывілізацыйных мадэляў Усходу—Захаду. У тлумачэнні ролі вышэйшай навучальнай установы ў развіцці адукацыі на беларускіх землях У.І. Пічэта, на наш погляд, звузіў ролю Віленскай акадэміі ў параўнанні яе з «цэтадэллю каталіцкай асьветы» [7, с. 10]. У артыкуле выразна праявіўся ацэначны погляд У.І. Пічэты на адукацыйную справу езуітаў. Нягледзячы на разуменне гісторыкам важнай ролі ордэна як распачынальніка працэсу станаўлення вышэйшай адукацыі на беларускіх землях, У.І. Пічэта імкнуўся да крытычнага разгляду дадзенай справы. Таксама трэба заўважыць, што даследчык адзін з першых падняў праблему самаідэнтыфікацыі гістарычнага мінулага беларусаў у рэлігійных сусветна-гістарычных працэсах XVI—XVIII ст.

## Заключэнне

Этап станаўлення беларускай гістарыяграфіі праблемы ўвабраў здабыткі рускай і польскай навуковай літаратуры другой паловы XIX — пачатку XX ст. Наяўнасць уплыву з боку іншанацыянальных гістарыяграфічных плыняў на станаўленне айчыннай гістарычнай навукі з'яўлялася асаблівасцю развіцця гістарыяграфіі Беларусі. Цяжар уплыву з боку рускага і польскага гістарыяграфічных накірункаў з аднаго боку перашкаджаў развіццю самастойнасці айчыннай гістарычнай думкі, з другога боку сфарміраваў імунітэт беларускім навукоўцам да навязвання інтэрпрэтацыйных традыцый дзейнасці езуітаў на Беларусі ў сферы адукацыі, які праявіцца толькі пад час 90-х гг. XX ст.

Такім чынам, адной з актуальных задач беларускіх гісторыкаў з'яўлялася навуковае вызначэнне ролі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях у апошняй трэці XVI — 20-х гг. XIX ст. Для яе вырашэння неабходнай умовай для даследчыкаў стаў пошук згубленых першакрыніц тэмы. На пачатку XIX ст. у імперыі пачала ствараццa агульнадзяржаўная сістэма асветы. Важнае месца ў гэтым працэсе адводзілася сістэме адукацыі былога ВКЛ. Гэта дазволіла ўпершыню ўвесці ў навуковы ўжытак шэраг важных дакументаў з архіваў Міністэрства народнай асветы і Віленскай акругі, якія тычыліся справы падрыхтоўкі рэформ асветы. У канцы XIX — пачатку XX ст. распачалося спецыяльнае даследаванне гісторыі адукацыі ў заходніх губернях. З канца XIX ст. у Расіі пачалася сістэматызацыя крыніц па гісторыі асветы. На жаль, гэтая праца не была завершана. Асновы працэсу выкладання, методыка і прынцыпы выкладання, этапы навучальнага курса з класна-урочнай структурай, вучэбнымі планамі і праграмамі; прынцыпы засваення школьнага матэрыялу падаюцца ў працы гісторыка XIX ст. А.П. Сапунова [8]. Значны крыніцазнаўчы матэрыял, які актыўна выкарыстоўвалі ў сваіх даследаваннях айчынныя гісторыкі, былі надрукаваны археаграфічнымі камісіямі і асобнымі аўтарамі, змяшчаліся ў зборніках дакументаў.

Другая палова XIX — 20-я гг. XX ст. характэрызуецца недастатковай распрацаванасцю базы крыніц па шэрагу кірункаў гістарычнага даследавання, у тым ліку і па гісторыі асветніцкай справы езуітаў на Беларусі. Суб'ектывісцкая метадалогія, накіраваная на тлумачэнне гістарычнага працэсу дзеяннем вышэйшых асоб, паступова саступіла месца навуковай метадалогіі, якая ўвабрала сукупнасць агульнанавуковых і ўласнагістарычных метадаў. Пачалося актыўнае назапашванне крыніцазнаўчай базы гісторыі асветы езуітаў на беларускіх землях.

Даследаванні айчынных гісторыкаў другой паловы XIX — пачатку XX ст. садзейнічалі ўстанаўленню і замацаванню асноў нацыянальнай гістарычнай навукі адносна гісторыі культурна-асветніцкіх спраў езуітаў на беларускіх землях. Ацэначны погляд навукоўцаў на адукацыйную дзейнасць езуітаў зыходзіў з прынцыпаў непарушнасці самабытнасці і самастойнасці беларускай культуры. Дадзеныя настроі адчувальны ва ўсіх работах другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. У гэтым дачыненні праявы ўплываў езуіцкай адукацыі разглядаліся гісторыкамі ў якасці інструменту паланізацыі вышэйшых колаў беларускага этнасу. Каталіцкі манаскі ордэн езуітаў разглядаўся гісторыкамі айчыннай гістарыяграфічнай плыні ў якасці ідэалагічнай зброі для павялічэння вернікаў каталіцкага касцёла. У гэтым кантэксце адлюстроўвалася дзейнасць езуітаў, якая вытрымлівала рэзкую крытыку з боку гісторыкаў (А.П. Дзем'яновіч, І.Я. Мітрашэнка, К.В. Харламповіч). Новыя тэндэнцыі ў даследаванні культуры і асветы Беларусі ўнеслі айчынныя гісторыкі другой паловы XIX — 20-х гг. XX ст. Але ў іх працах, нягледзячы на сабраны і па-свойму асэнсаваны ў іх цікавы матэрыял, яшчэ не было адказу на многія пытанні гісторыі асветы Беларусі. Так, вывучэнне гісторыі езуіцкай асветы паказала адсутнасць у айчыннай гістарыяграфіі комплекснага абагульняючага даследавання, прысвечанага аналізу стану адукацыі езуітаў на Беларусі. Гістарычныя аспекты адукацыйнай работы езуітаў разглядаліся навукоўцамі выключна ў кантэксце палітыч-

БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by